Іртутнае срэбра жыцця



На момант выхаду гэтай кнігі яе аўтар Алесь Бяляцкі, старшыня праваабарончага цэнтра «Вясна» і віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека (FIDH), адбывае тэрмін у 14-м атрадзе бабруйскай папраўчай калоніі №2.
І не проста адбывае, працуючы ўпакоўшчыкам ў пашывачным цэху, дзе штодня выварочвае міліцэйскія пагоны, складае рукавіцы ці іншыя вырабы, а шмат часу прысьвячае творчай працы.
Ён чытае, піша артыкулы, нататкі, успаміны, рэцэнзіі і, вядома ж, лісты, бо вядзе багатую перапіску.

За грамадскай і праваабарончай дзейнасьцю, за штодзённымі клопатамі і справамі на волі Алесь не пасьпяваў рэалізавацца ў літаратурнай сферы, таму зараз выкарыстоўвае гэтую магчымасьць.

Як напісаў ён у адным зь лістоў, “я вяртаю пазыку — раблю, адпісваюся, тое, што мусіў рабіць з 30 да 45 гадоў, калі больш-менш навучыўся пісаць і зразумеў, што гэта такое. Урэшце, гэта і паказальнік таго, як я выкладваўся на папярэдніх працах, якія забіралі ўсю энергію і ўвесь час. А зараз — рукі (пальцы) працуюць, а мазгі — вольныя”.

Алесь Бяляцкі

Іртутнае срэбра жыцця



Алесь Бяляцкі

Іртутнае срэбра жыцця

Пралог

Нататкі праваабаронцы